Генрых ДАЛІДОВІЧ

# З ГЛІНІШЧА — У СВЕТ ВЯЛІКІ

***Да 85-годдзя з дня нараджэння Івана Мележа***

Івана Паўлавіча пабачыў студэнтам філфака Белдзяржуніверсітэта, у годзе 1964-м, калі да нас на семінар, прысвечаны ягонаму раману «Людзі на балоце», яго прывёў выкладчык сучаснай беларускай літаратуры.

Госць хораша ўразіў мужчынскай гармоніяй — росласцю, як некалі казалі, высокім чалом, па-маладому зачасанымі на правы бок негустымі валасамі, сталым, упэўненым позіркам чалавека сярэдняга веку (яму бралася пад сорак пяць) і прызнанага пісьменніка. І яшчэ ўсмешкай— нібыта трошкі сарамлівай, нібыта мякка-сумнаватай.

Зрэшты, найбольш — менавіта ёю, усмешкай у глыбакаватых вачах. Праўда, калі гаварылі іншыя, у тым ліку, хвалюючыся, палаючы шчокамі, прамаўляў і я («Вобразы жанчын у рамане Івана Мележа «Людзі на балоце»), яна, першабачная ўсмешка, змянілася на цікаўнасць: што за сённяшнія філфакаўцы, што за маладыя пісьменнікі — менавіта так прадставілі мяне, хоць на той час маё пісьменніцтва было толькі ўсяго на ўзроўні змешчанага ў студэнцкай насценнай газеце апавядання «Дзічка», якое пасля знікла разам з той насценнай газетаю. Па заканчэнні сустрэчы Мележ запытаў, ці паказваў я ў якой рэдакцыі свае творы, параіў пачаць з «Маладосці», падпісаў цёплае пажаданне на старонцы яго твора (неўзабаве хтосьці з калег-студэнтаў «пазычыў» кнігу і не вярнуў яе). Ёсць толькі іншая кніга з ягоным пазнейшым надпісам.

Пазней, пацёршыся ў рэдакцыях і сярод літаратараў, уведаў сакрэт Мележавага смутку: завязь ягонага таленту пачала расці, наліваццa палескімі сокамі пад усясветным сонцам, наперадзе было шмат вельмі патрэбнай пісьменніцкай, нават больш — якраз *ягонай* працы, а здароўя не было. Мала, што на вайне цяжка паранілі (20 чэрвеня 1942 пад Растовам; скалечаны плячук літаральна складалі па костачках), дык яшчэ прычапіўся букет розных хвароб (нырак, лёгкіх і інш.), што пастаянна прыносілі пакуту. Ён не ўсім пра гэта расказваў — некаторыя недасведчаныя лічылі, што ён, пры жыцці ўжо акласікавелы, быццам наўмысна кволіцца, каб прыцягнуць да сябе ўвагу, спачуванне, а то і захапленне яго мужнасцю і творчай удачай.

У прозе Мележ дэбютаваў неверагодна рана: яшчэ дванаццацігадовым хлапчуком (1933) даслаў сваё апавяданне на прапанаваныя часопісам «Іскры Ільіча» (з 1945 г. «Бярозка») малюнкі, і яно было прызнана лепшым. У 1938-м закончыў выдатнікам школу ў Хойніках, што давала яму магчымасць лёгка паступіць і ў Маскоўскі інстытут гісторыі, філасофіі і культуры, але масквічы «схімічылі», не дапусцілі, а сціплы паляшук не дабіваўся сваіх правоў. Паступіў ужо на наступны год, калі папрацаваў на розных пасадах і надрукаваў вершы ў «Чырвонай змене» і «ЛіМе», але правучыўся там нядоўга: у 1940-м яго ўзялі ў армію, а неўзабаве — удзел у баях за Паўночную Букавіну і Бесарабію.

Пасля ранення знаходзіўся ў шпіталях розных паўднёвых гарадоў, дзе лячыўся і пісаў апавяданні, пасля некаторай папраўкі быў студэнтам і выкладчыкам у педінстытуце ў Малдавіі і ў Белдзяржуніверсітэце пад Масквой. У 1944-м з лёг-

кай рукі Кузьмы Чорнага друкуе апавяданне ў «Звяздзе», а ў 1946-м, ужо членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, выдае першы зборнік прозы «У завіруху». Як бачым, для маладога чалавека і пісьменніка крок наперад даволі ўпэўнены. Ды нават з удалым пачаткам у кожнага (чым бы хто ні займаўся) бывае не толькі свой значны працяг, але часамі і нечаканы, складаны далейшы лёс: у адных — яшчэ больш плённы, у іншых — замарудлівы альбо і нешчаслівы. У Мележа таксама працяг шляху ў прозу склаўся няпросты. На тое было шмат самых розных прычын.

Можна меркаваць, што, апроч жыццёвых турбот (сям'я, вучоба ў аспірантуры і навуковая праца, прысвечаная творчасці К. Чорнага, і падзаробак у часопісе «Полымя», пасля служба ў ЦК КПБ), былі і іншыя, якія не спрыялі плёну ў прозе. Гэта — мабыць, найперш пануючая тады ў літаратуры сістэма вульгарнага сацыялагізму, калі трэба было адлюстроўваць слаўную сучаснасць з яе слаўнымі поспехамі, слаўных сучаснікаў — найперш камуністаў, герояў перадавікоў, з канфліктаў паказваць толькі барацьбу лепшага з добрым. І ўсё гэта пад пільным назіркам ідэёлагаў, крытыкаў-«носьбітаў» чысціні партыйнасці і народнасці, сацыялістычнага рэалізму. Колькі тады ў СССР было напісана «высокаідэйных» твораў, якія былі ўганараваныя Сталінскімі прэміямі, але многія з якіх амаль адразу пасля паднятага вадзянога шуму каменем бултыхнулі на дно — пры першым жа з'яўленні сапраўднага, высокамастацкага твора.

Цікава прасачыць, як называліся рэцэнзіі ў 1940-х — першай палове 1950-х гадоў на зборнікі яго апавяданняў і аповесцей «Блізкае і далёкае», «У гарах дажджы», «Што ён за чалавек», «Гарачы жнівень» і інш. Вось: «Удалы пачатак», «Рассказы о простых людях», «О самых скромных», «Апавяданні аб простых людзях» і г. д. Хіба не гучэла ў падтэксце, што і сам аўтар — асоба сціплая, простая? Першы яго раман «Мінскі напрамак» спачатку не хацелі ўвогуле выдаваць. А калі ён пабачыў свет, зноў жа пайшлі далёка не захапляльныя рэцэнзіі. Нібы пра нейкія брашуру або буклет: «Твор аб Вялікай Айчыннай вайне», «Твор аб вызваленні Мінска, «Аб правамерным і выпадковым», «Непросто, неровно шла дорога» і г. д. Канечне, аўтару твораў не лёгка было ўсё гэта ўспрымаць, тым больш, што яму яшчэ ў 1950-м па стане падарванага здароўя давалі II групу інваліднасці, але ён папрасіў III, каб кожныя тры месяцы не праходзіць медкамісію. І, можа, толькі ён адзін ведаў: са сваімі «сціплымі» і «простымі» героямі з тых жа сваіх сціплых паляшуцкіх мясцін, дарагога сэрцу Глінішча ён яшчэ скажа важкае слова і выйдзе ў свет вялікі.

Пайшоў 1956 год — шмат у чым пераломны і для былога СССР, і для ўсяго свету. Гэта абумовіў XX з'езд КПСС, дзе быў выкрыты «культ асобы» Сталіна і ўголас названыя многія злачынствы, якія ён учыніў. Пачаўся перыяд хрушчоўскай «адлігі», калі ў грамадстве панізіўся ўзровень страху за сваё нават неасцярожна сказанае слова, узаемападазронасці, даносаў, пагрозы арышту, расстрэлу. Прадоўжыліся іншыя матэрыяльныя і духоўныя аблёгкі для ўсяго грамадства. Усё гэта асабліва востра паўплывала на пісьменніцкае асяроддзе, найбольш адчувальнае да неабходнасці жывога, праўдзівага мыслення і слова, грамадска-духоўных перамен.

У Мінску адліжвалася нашмат цяжэй, чым у Маскве. Тут і сярод літаратараў вялікую моц мелі, як казалі тады, «былыя». Яны ўжо не маглі адкрыта славіць свайго куміра, затаілі злосць на Хрушчова і моцна трымалі ў руках асноўнае для іх — сталінскія догмы сацыялізму і сацыялістычнага рэалізму, паколькі сталінізм як каманда-адміністрацыйная сістэма пераасэнсоўваўся ў асноўным павярхоўна, без асаблівых ідэйных і канстытуцыйных змен, толькі з некаторай рэтушшу. Ды «адліга» паспрыяла перавыдаць некаторыя творы рэпрэсаваных, а ў 1950-я рэабілітаваных пісьменнікаў, дзе быў засведчаны погляд на станаўленне сацыялізму, на тую ж калектывізацыю як на спрэчны працэс («Вязьмо» М. Зарэцкага, «Спалох на загонах» П. Галавача і інш.), а таксама пачалі па-новаму асэнсоўваць творы К. Чорнага з яго эпахальным «уводам» беларускай вёскі (мястэчка) з яе насельнікамі з канца XIX стагоддзя, г. зн. з капіталізму, у 1930-я, у сацыялізм (раманы «Бацькаўшчына»



*Мікалай Аляксееў, Іван Мележ, Пятрусь Броўка, Максім Танк. 1973 г.*

і «Трэцяе пакаленне», аповесць «Лявон Бушмар»). «Адліга» натхніла творчую моладзь, якая нарадзілася ў 1930-х, не столькі бачыла, колькі запомніла, усвядоміла ад бацькоў усе жахі калектывізацыі, «хапуноў», перажыла жудасці вайны, пасляваенныя беднасць і новыя «закруткі гаек». Маладыя даволі рэзка абрынуліся на папярэднікаў, якія многае абышлі сваёй увагай, а то і зганьбілі, але мелі незаслужаныя лаўры; яны, маладыя, пачалі пісаць пра тое, пра што раней замоўчвалася. Яшчэ недасканала, але шчыра і натхнёна, праўдзіва. Да ўсяго яны пачалі на першы план вылучаць не ідэйную зададзенасць, а, як у свой час Я. Купала, Я. Колас, М. Багдановіч, М. Гарэцкі, К. Чорны, жыццёвую праўду, псіхалагізм, высокую культуру моўнай і мастацкай творчасці.

У 1968-м я, грэшны, абараніў дыпломную на тэму «Маладая беларуская проза» (І. Пташнікаў, В. Адамчык, Б. Сачанка, І. Чыгрынаў, М. Стральцоў). Тады яшчэ не было па іхняй творчасці не толькі манаграфій, але і грунтоўных артыкулаў— толькі станоўчыя, напаўстаноўчыя і «аглабельныя» раздзелы з артыкулаў і рэцэнзіі. Зразумела, я ўсё тое перачытаў. Дык вось дазвольце прывесці адзін прыклад па адносінах да творчасці Мележавага земляка па Хойніцкім раёне Б. Сачанкі: ён у 1962-м выдаў другую кнігу прозы «Барвы ранняй восені», дзе ярка выявіў сваё «я», дык займеў аглабельную крытыку ў «Звяздзе» за тое, што яго некаторыя крытычныя да рэчаіснасці творы — «у бычыным пузыры антысаветчыны» (пагромшчык, як расказваў Барыс Іванавіч, ужо не асмеліўся падпісаць абвінавачванне сваім прозвішчам, схаваўся, як і ў былыя часы, пад псеўданімам, але: «Даношу…»). Сёння смешна чытаць папрокі Сачанку (апавяданне «Канапляны чад») за тое, што герой твора па вечарах у каноплях мілуецца з чужой жонкай. Выкіньце гэтыя «здрады», «антымараль» з твораў Л. Талстога, А. Чэхава, І. Буніна, М. Шолахава — якая страта будзе нанесена не толькі іхнім творам, але і ўсёй сусветнай літаратуры! Напрыклад, які будзе той жа «Ціхі Дон» без лініі Рыгор Мелехаў — Аксіння? Больш — беларуская нават і высокапраўдзівая, і высокамастацкая літаратура шмат траціла ад таго, што як след не апісвала каханне і ягоныя перыпетыі. Пазнаёміліся, злюбіліся, і праз год у іх нарадзілася дзіця… Тады Сачанку прыняў першы сакратар ЦК КПБ К. Мазураў і доўга гутарыў з ім, у выніку чаго пабольшала цярпімасць да творчасці маладых.

Было і іншае: *у многім слушны рэфарматар Хрушчоў загарэўся сваёй ідэяй:* Ленін — Сталін ашчаслівілі савецкі народ сацыялізмам, а я ашчаслівлю камуніз-

мам. Толькі старэйшае наша пакаленне помніць тагачасны лозунг: «Нынешнее поколение советских людей будет жить при коммунизме», г. зн. прыкладна ў 1980 годзе. Хрушчоў альбо сам надавуміўся, альбо яго надавумілі вераломныя дарадцы-ідэолагі: гэты зямны рай наступіць хутчэй, калі ў СССР, які не толькі «догонит и перегонит Америку по всем экономическим показателям», на аснове інтэрнацыяналізму будзе створана адна супольнасць («савецкі чалавек»), пройдзе дэнацыялізацыя і на аснове рускасці будзе створана адна агульнасавецкая мова і культура. На жаль, гэты нежыццёвы, згубны для ўсяго традыцыйна-гістарычнага, нацыянальнага лозунг асабліва ўвішна быў падхоплены ў Беларусі — па закрыцці беларускамоўных садкоў, школ, па адцясненні беларускай мовы з ВНУ, партыйна-дзяржаўных устаноў, увогуле з ужытку. За гэта хвалілі: «Малайцы беларусы! Першыя будуць у камунізме!» Асабліва ўзмацнілася гэтая тэндэнцыя, калі не стала Я. Коласа, які перасцерагаў: «Не рабіце гэтага, не чыніце шкоды народу, яго мове і культуры! Будуць страты і беззваротныя!» Знайшліся і такія, хто, наслухаўшыся размоў на маскоўскіх кухнях пра ўсечалавечнасць, пачалі падводзіць да думкі: усё, беларускія званы адзвінелі, скончыліся на Коласе!

На апошнім варта было запыніць увагу таму, што тады, у пераломны перыяд, Мележ не асабліва актыўнічаў у розных творчых і нятворчых перапалках (яму нават рабіліся закіды, што ён грамадска неактыўны), толькі час ад часу падаваў голас пра выдатную творчасць сусветных класікаў, у тым ліку і савецкіх, беларускіх. Многія ведалі, што ён засяродзіўся дома, піша новы твор, але, як пазней стане вядома, толькі лічаныя людзі знaлі, які твор. Што ён пра «просты» люд 1920-х гадоў з «простай» палескай вёскі, які падаваў ужо свой голас раней. Толькі прасіў паслухаць асобныя месцы. А тут — пра сваё жыццё з усімі яго дзяржаўна-грамадскімі праблемамі і асабістымі турботамі ўсебеларускага, можа, нават і ўсесялянскага значэння.

У восьмым нумары часопіса «Полымя» за 1961 год з'явіўся пачатак Мележавага рамана «Людзі на балоце». Было, той-сёй хмыкнуў: «Ат, старое, 20-я гады!» Але чуйныя на сапраўдную прозу чытачы, усе літаратары чакалі працягу з нецярпеннем. І ўжо тады ж, у кастрычніку (17), першы водгук на публікацыю ў «ЛіМе» аўтара шматлікіх цудоўных апавяданняў Я. Брыля з выразным і ўх-



*У перапынку на чарговым пленуме пісьменнікаў. Чацвёрты справа Іван Мележ. 1974 г.*

вальным загалоўкам «Запаветная песня». Пасля проста пасыпаліся і іншыя захапляльныя рэцэнзіі. Спрэчкі-дыскусіі пра далейшы шлях беларускай прозы фактычна скончыліся: ён быў таленавіта і плённа падкрэслены «Людзьмі на балоце». З аднаго боку, гэта было аднаўленнем чорнаўскага, а з другога — станаўленнем яго на новым этапе.

Мележу ўдалося і тое, чаго не ўсе менавіта ад яго чакалі: няспешнае, дакладнае і яркае апісанне палескай вёскі, яе шматлікіх насельнікаў рознага ўзросту і з рознымі характарамі, дастаткам, іхняга штодзённага побыту (не заўсёды цікавага ды вясёлага, але заўсёды патрэбнага). Жыла вёска са стагоддзя ў стагоддзе па сваіх звычаях і абрадах , па забабонах, бедна і багата. Старыя пamіралі, маладыя кахаліся, нараджаліся дзеці, сталелі, уцягваліся ў працу, турботу, адыходзілі — і так пакаленне за пакаленнем. Але вось адбыліся рэвалюцыі 1917 гадоў, грамадзянская вайна, усталявалася савецкая ўлада з яе імпэтам да разбурэння старога і сцвярджэння новага, што не магло не прынесці сацыяльныя, псіхалагічныя, духоўныя змены ў вёску — як на лепшае, так і на трагедыі.

Любоўныя шматкутнікі: Васіль, Ганна, Яўхім, Хадоська, Хоня, Міканор — апісаннем іхняга духоўнага свету, светлых і грубых пачуццяў спраўдзілася тое, чаго ўжо даўно чакала беларуская проза. У прыватнасці, вобраз Ганны стаўся адным з самых яркіх вобразаў усёй беларускай літаратуры, і, як вядома, яе на сцэне Купалаўскага тэатра выдатна ўвасобіла Лілія Давідовіч (яе Мележ пяшчотна называў Ганначкай). Яшчэ Іван Паўлавіч не проста ўразіў сваёй багатай, настоенай палескімі зямлёй і сокамі, беларускай мовай, але свежа ўдыхнуў у яе жыццёвасць, паўнакроўнасць, надаў ёй хараства, высокай культуры. Працяг «Людзей на балоце» новым раманам «Подых навальніцы» (Полымя, 1965, №№ 9—11) стаўся «Палескай хронікай» і яшчэ больш умацаваў высокую рэпутацыю Мележа-празаіка як у беларускай, так і ва ўсёй савецкай літаратуры, яго раманы, як і творы В. Быкава, пачалі шырока перакладацца і выдавацца за мяжой, а ў 1972-м ён заслужана атрымаў за дылогію Ленінскую прэмію. Дылогію адзін з нашых вядомых крытыкаў назваў «сястрой «Ціхага Дона». Прыемнае параўнанне, але, мякка кажучы, недарэчнае: у сясцёр павінны быць адны бацька і маці.

Маё асабістае блізкае знаёмства з Іванам Паўлавічам у літаратурным асяроддзі пачалося з 1973 года, калі мяне, настаўніка і аўтара паўдзесятка надрукаваных апавяданняў, Б. Сачанка, І. Пташнікаў, К. Кірэенка запрасілі ў часопіс «Полымя», дзе з верасня я пачаў працаваць у аддзеле прозы. Зрэдку бачыў, чуў Мележа ў гэтым выданні, больш — у Саюзе пісьменнікаў на сходах і літвечарах. На пачатку 1974 года надрукаваў першую аповесць «Усё яшчэ наперадзе» ў часопісе «Маладосць»; Мележ паклікаў у СП (яго сумесны з А. Грачанікавым кабінецік знаходзіўся на другім паверсе былога «дома Кубэ») і пачаў гартаць тыя нумары часопіса, дзе шмат было скрэслена: вось так, малюнкамі, дэталямі, пішыце, а вось так не, бо гэта — не столькі проза, колькі публіцыстыка. Пасля параіў і без кнігі афармляць дакументы ў СП, куды я з лёгкай яго рукі (ён быў старшынёй камісіі СП па прыёме), на трэцім, заключным этапе ўжо з кніжачкай быў прыняты ў жніўні. Зразумела, я, адзін з «палымянцаў», з вялікімі хваляваннем чакаў Івана Мележа напрыканцы 1976-га, калі ён меўся прынесці новы раман «Завеі, снежань», і з не меншым хваляваннем чытаў, душой ловячы кожнае Мележава слова, кожны, часамі «рублены», г.зн. кароткі, нават з аднаго слова сказ, які быў неабходны і для інтанацыі. «Завеі, снежань», надрукаваны ў №№ 3—6 за 1976 год, быў выдатным далейшым поступам нацыянальнай школы беларускай прозы.

І нібы асляпляльны, знішчальны ўдар маланкі: 9 жніўня 1976 года Мележа не стала. Якая страшная несправядлівасць: ён пакінуў жыццё, літаратуру ў росквіце творчых сіл, непаўторным майстрам прозы (я ўдзельнічаў у пахавальнай працэсіі, тады ж даволі падрабязна апісаў апошні шлях класіка, але пра гэта пазней). Добра запомнілася, што пры развітанні плакаў тагачасны першы сакратар ЦК

КПБ П. Машэраў, а ў прамове намесніка старшыні Савета міністраў БССР Н. Сняжковай былі такія словы за жалобным сталом у Доме літаратара: «Мы ўсе, а вы, пісьменнікі, найперш, яшчэ адчуем, каго мы сёння страцілі…»

У 1978-м у «Полымя» пачаў рыхтавацца да друку працяг рамана «Завеі, снежань» — закончаныя раздзелы, накіды, планы, заўвагі. Спачатку той крытык, што «ўсястрыў» апошнія раманы Мележа з «Ціхім Донам», меўся падрыхтаваць публікацыю — аўтаравы ўрыўкі і свае каментарыі. Пасля ён адмовіўся ад гэтай задумы, перадаў папку ў рэдакцыю. Сціплая пасада супрацоўніка аддзела прозы тады не дазваляла мне шмат ведаць, дык я спачатку не зразумеў: чаму працэс падрыхтоўкі, пачатак друкавання затрымліваецца. Ды чыйго твора? Мележавага! Пасля мне было даручана абхадзіць усіх членаў рэдкалегіі і паказаць ім пакінутае Мележам з чыімісьці алоўкавымі выкрэсліваннямі. Зразумела, за ноч прачытаў усё сам і пабачыў, што насцярожыла наша (і не толькі рэдакцыйнае) кіраўніцтва. Мележ распрацоўваў новы погляд на калектывізацыю — як на з'яву паспешлівую, гвалтоўную і небяспечную для вёскі, яе гаспадароў на будучыню (і яму тады, скажам, не маглі дараваць, што пры «раскулачванні» ў раённым Доме культуры ўпотай, уночы, размясцілі ўзвод чырвонаармейцаў ці што вязуць у высылку «кулака», а ў яго з багацця самавар і больш як дзесяць дзяцей…). Як добра помніцца, з усіх членаў рэдкалегіі не толькі абураўся выкрэсліваннямі, але і запісаў сваю асобную думку адзін Я. Брыль, іншыя, мабыць, не жадаючы сабе непрыемнасцей, паслухмяна ўсё адобрылі (К. Крапіва высока цаніў Мележаву трылогію, з-за яе, сказаў, ён не палічыў патрэбным працягваць свае «Мядзведзічы», але падкрэсліў, што «знішчэнне кулацтва як класа было партыйнай лініяй, што пазней апраўдала сябе, і Мележ дарэмна задумаў абвергнуць гэта…») Здаецца, не ўсё з выкрасленага было аднаўлена ў Мележавым дзесяцітомніку, дык варта ў «палымянскім» архіве адшукаць тую папку і ў новым выданні рамана «Завеі, снежань» даць цалкам тое, што было думана-перадумана і запісана аўтарам, які глыбока перажываў і за мінулы, і за сённяшні, і за будучы лёс нашай вёскі, яе насельнікаў, за вернасць літаратуры жыццёвай і мастацкай праўдзе, гуманізму.

Тое, што цяпер пра Івана Паўлавіча Мележа, як і пра Я. Коласа, М. Гарэцкага, К. Чорнага, Л. Калюгу, В. Адамчыка, Б. Сачанку, М. Стральцова і іншых нашых таленавітых, глыбокіх празаікаў, нібы і няма гаворкі, гэта — найперш несправядліва і крыўдна. Ды новае прачытанне іхніх твораў, прызнанне ўсё роўна будзе: лепшае з напісанага імі пазначана боскасцю.